## 2023 г. – 60 гадоў з часу заснавання Грушаўскага рамонтна-механічнага завода (ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» ; Кобрынскі р-н ; 1963)



Сваю гісторыю ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці вядзе з пасляваенных гадоў. Завод пачынаўся як коннае дэпо, утворанае адразу пасля вызвалення Грушава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пазней пераўтворана ў машынна-трактарную станцыю, у 1963 годзе — у рамонтна-экскаватарную майстэрню Белгалоўмеліяводгаса.

У сакавіку 1980 года загадам Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР майстэрня была пераўтворана ў Грушаўскі рамонтна-механічны завод (РМЗ). Прадукцыю прадпрыемства выкарыстоўвалі меліярацыйна-будаўнічыя і эксплуатацыйныя арганізацыі Міністэрства меліярацыі БССР, арганізацыі Галоўпалессеводбуда.

Так працягвалася да 1990 года, калі паступова заказы заводу на вытворчасць меліярацыйнага абсталявання пачалі падаць. Прадпрыемства, каб выжыць у цяжкі час, вымушана было асвойваць вытворчасць новых відаў тавараў для іншых галін гаспадаркі. Вяліся работы па вытворчасці зборна-шчытавых дамоў, аконных і дзвярных блокаў, убудаванай мэблі, паганажных вырабаў. Былі запатрабаваныя механаапрацоўка і зварачная вытворчасць. Для ўнікальнага прадпрыемства дыверсіфікацыя стала магчымасцю выжыць.

29 снежня 2000 года Грушаўскі РМЗ быў пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства. Акцыяніраванне прадпрыемства дало больш свабоды і самастойнасці, паспрыяла пераарыентацыі калектыву на выраб якаснай прадукцыі, якая прыносіла прыбытак.

Цяпер ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» ДА «Брэстмеліявадгас» – гэта магутнае прамысловае прадпрыемства з сучасным абсталяваннем, адно з нешматлікіх прадпрыемстваў СНД, якое вырабляе меліярацыйнае і іншае нестандартнае абсталяванне. РМЗ з'яўляецца адзіным у рэспубліцы распрацоўшчыкам і трымальнікам тэхнічных умоў і

вытворцам прадукцыі для меліярацыйнай галіны. Завод пастаўляе сваю прадукцыю амаль усім прадпрыемствам ДА «Белвадгас», арганізацыям Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, будаўнічым прадпрыемствам. РМЗ унёс свой уклад у рэканструкцыю некалькіх беларускіх міні-ГЭС, у аснашчэнні Аўгустоўскага канала, вяслярнага канала ў Заслаўі, а таксама ў рэканструкцыі міні-ГЭС у Прыбалтыцы. Засаўкі і пад’ёмнікі Грушаўскага РМЗ стаяць на большасці вадасховішчаў краіны, у тым ліку на Салігорскім вадасховішчы і Мінскім моры.

Сёння, акрамя асноўнага віду дзейнасці, Грушаўскі РМЗ таксама вырабляе будаўнічыя металаканструкцыі, зборныя канструк-цыі, займаецца дрэваапрацоўкай. Дрэваапрацоўка займае каля 25% ад аб'ёмаў вытворчасці. Астатняе - механаапрацоўка і зварачная вытворчасць. Вырабляюцца катлы, газаходы, коміны, бакі, раз'яднальнікі і трубы для кацельняў, воданапорныя вежы і іншае нестандартнае абсталяванне. Па сутнасці, на прадпрыемстве могуць вырабіць любое нестандартнае абсталяванне, і гэта — той шлях, які дазваляе заводу заставацца на плаву.

На ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» вядзецца мэтанакіраваная праца па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, дасягненні прагнозных паказчыкаў, пашырэнні і ўдасканаленні асартыменту выпускаемай прадукцыі, рацыянальным выкарыстанні працоўнага часу. Завод вядзе тэхнічнае пераўзбраенне: у прыватнасці, зварачны цэх абсталяваны ўстаноўкай для плазменнай рэзкі металу, якая дазволіла палепшыць якасць зварачных работ і напалову скараціць спажыванне электраэнергіі. Магутныя зварачныя трансфарматары заменены на новыя паўаўтаматы фірмы «Олівер», у якіх намінальная магутнасць складае 15 кілават. Ідзе мадэрнізацыя наяўнага абсталявання, надаецца ўвага эканомнаму выкарыстанню матэрыяльна-тэхнічных і паліўна-энергетычных рэсурсаў, энергазберажэнню, рэнтабельнасці вытворчасці, што спрыяе вырашэнню сацыяльных пытанняў у інтарэсах калектыву.

Прадпрыемства працуе стабільна, з добрымі вытворчымі паказчыкамі. Адзначаецца высокі ўзровень працоўнай дысцыпліны і адказнасці работнікаў. Сістэмна праводзіцца работа па павышэнні якасці выпускаемай прадукцыі - укаранёна сістэма менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2015.

Галоўны рухавік поспеху любога прадпрыемства - гэта

калектыў, людзі. Грушаўскі РМЗ – адно з нешматлікіх прамысловых прадпрыемстваў, якія працуюць у сельскай мясцовасці, пры гэтым сярэдняя зарплата тут дастойная. Калектыў папаўняецца новымі работнікамі на конкурснай аснове. Актыўна працуе прафсаюзная арганізацыя, падтрымліваюцца шматдзетныя сем'і, работнікам аказваецца матэрыяльная дапамога, працоўныя дынастыі тут норма. Арганізавана дастаўка работнікаў на работу заводскім транспартам. Нараўне з маладымі кадрамі працуюць ветэраны, якія аддалі заводу не адзін дзясятак гадоў і гатовыя дзяліцца вопытам.

Дырэктар Грушаўскага РМЗ Пётр Сяргеевіч Папроцкі вось ужо 25 гадоў паспяхова кіруе прадпрыемствам, а поўны стаж работы на родным прадпрыемстве ў дырэктара — большы за 40 гадоў. Вытворчыя клопаты далёка не поўны спектр праблем, якія вырашае П. С. Папроцкі. Ён прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Кобрынскага раёна. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Савета дэпутатаў. За выдатны асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна ў 2020 годзе П. С. Папроцкаму прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» заваявала рэпутацыю надзейнага вытворцы, якое своечасова, а галоўнае, якасна выконвае любы заказ. Для гэтага ёсць высокакваліфікаваныя спецыялісты, вялікі парк станкоў, а таксама неабходнае абсталяванне.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна,*
*бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Грушаўскі рамонтна-механічны завод»** (1963) – 60 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 103.

**65 гадоў з дня нараджэння П. С. Папроцкага (1957)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 56.

**Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага раёна. Папроцкі Пётр Сяргеевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік. – 2-е выд., дап. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 55-56 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Листьева, В**. Приумножают достижения / Валентина Листьева // Живая вода. — 2022. — 23 июля (№ 30). — С. 1.

О работе ОАО «Грушевский ремонтно-механический завод» Кобринского района.

**Семенов, С.** Коллективный подход к решению задач / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. — 2022. — 28 сентября (№ 9). — С. 2 : фот. - (приложение: Рекламный калейдоскоп ; № 9).

По материалам беседы с директором Грушевского ремонтно-механического завода Кобринского района П. С. Папроцким.

**Шведов, О.** Повезло заводу з директором / Олег Шведов ; фото Валентины Наварич // Живая вода. — 2022. — 26 ноября (№ 48). — С. 2 : фот.

О работе ОАО «Грушевский РМЗ» Кобринского района и его директоре Петре Папроцком.

**Энергия** лидерства / (соб. инф.) // Живая вода. - 2022. - 5 марта (№ 10). - С. 3.

О работе Грушевского ремонтно-механического завода Кобринского района.

**Анцэлевіч, А.** Завод і людзі / Аляксандра Анцэлевіч ; фота аўтара і Алены Даўжанок // Звязда. – 2021. – 14 жніўня (№ 155). – С. 6 : фат.

Пра работу ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» Кобрынскага раёна.

**Мельнік, Р. В**. Міхаіл Грышкевіч: «Залог поспеху — згуртаваны калектыў» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2021. — 19 жніўня (№ 65). — С. 2 : фат.

Сустрэча-справаздача са старшыней Кобрынскага райвыканкама прайшла ў ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод».

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах : Почётный гражданин Кобринского района / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 26 августа (№ 34). – С. 4.

**Листьева, В**. Плюс в свою пользу / Валентина Листьева // Живая вода. — 2021. — 9 октября (№ 42). — С. 2.

О работе ОАО «Грушевский ремонтно-механический завод» Кобринского района.

**Мануйлик, М.** Диверсификация плюс модернизация / Марина Мануйлик ; фото Павла Орловского // 7 дней. – 2021. – 22-28 апреля (№ 16). – С. 17.

О работе ОАО «Грушевский ремонтно-механический завод» Кобринского района по материалам беседы с директором П. Папроцким.

**Мануйлик, М.** Диверсификация плюс модернизация / Марина Мануйлик, Павел Орловский // Живая вода. — 2021. — 28 мая (№ 23). — С. 4 : фот.

О работе ОАО «Грушевский ремонтно-механический завод» Кобринского района по рассказу директора П. С. Папроцкого.

**Бялоў, Д.** Слаўся, Кобрыншчына, працай людзей! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020.– 22 студзеня (№ 5). – С. 1-2.

За выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна званне «Ганаровы грамадзянін Кобрыншчыны» прысвоена дырэктару ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» Пятру Папроцкаму.

**Наварич, В**. Самоотдача – правило команды / Валентина Наварич // Живая вода. - 2020. - 7 ноября (№ 45). - С. 3.

О деятельности ОАО «Грушевский РМЗ» Кобринского района по материлам беседы с директором П. С. Папроцким.

**Папроцкий, П. С**. Мы берёмся за любую работу / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. — 2020. — 4 марта (№ 3) — С. 3. - (Приложение: Рекламный калейдоскоп).

Беседа с директором Грушевского ремонтно-механического завода Кобринского района П. С. Папроцким.

**Семенов, С.** Мы беремся за любую работу / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. – 2020. – 4 марта (№ 3). - – С. 3 : фот. - (приложение: Рекламный калейдоскоп).

За неоценимый личный вклад в развитие экономики Кобринщины директору «Грушевского РМЗ» П. С. Папроцкому присвоено звание «Почетный гражданин Кобринского района».

**Белов, Д.** Петр Папроцкий: «За свое дело и свой регион нужно болеть душой!» / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. - 11 верасня. - С. 1-2 : фот.

За высокие достижения директор ОАО «Грушевский РМЗ» Пётр Папроцкий занесён на районную Доску почёта.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг ОАО «Грушевский РМЗ» за 2018 год // Заря. - 2019. — 30 марта. — С. 19.

**Муха, Ф.** В поиске идей / Федор Муха ; фото Валеря Короля // Заря. - 2019. — 18 декабря (№ 100). — С. 17 : фот.

История и сегодняшний день ОАО «Грушевский РМЗ».

**Папроцкий, П. С.** Завод, не теряющий актуальности / П. С. Папроцкий ; [беседовал] Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. - 2017. - 2 августа (№ 15). - С. 1**.**

О работе Грушевского ремонтно-механического завода Кобринского района - беседа с директором П. С. Папроцким.

**Руками** грушевских мастеров // Кобрынскі веснік. - 2017. — 21 студзеня. — С. 1.

На ОАО «Грушевский ремонтный завод» осваивают выпуск новых видов продукции.

**Шведов, О**. Его путь лежал только наверх / Олег Шведов // Живая вода. - 2017. - 10 июня (№ 24). - С. 2.

Директору ОАО «Грушевский РМЗ» П. С. Папроцкому исполнилось 60 лет.

**Дубіна, Л**. Вырашэнне праблем камандай - дзейсны спосаб / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 27 ліпеня. — С. 4.

Дырэктар ААТ «Грушаўскі рамонтны завод» П. Папроцкі – аб прадпрыемстве.

**Дубина, Л.** С новым станком - лучшее качество / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. — 30 студзеня. — С. 4.

В ОАО «Грушевский ремонтно-механический завод» установили современный токарно-винторезный станок.

**Одним** абзацем // Кобрынскі веснік. - 2015. — 11 лістапада. — С. 4.

О работе Грушевского ремонтно-механического завода.

**Папроцкий, П. С.** Грушевский РМЗ: уникальность и перспективы / П. С. Папроцкий, [беседовал] Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. – 2015. - 7 лютага. – С. 3.

**Сідарук, І.** Працавіты! Шчыры! Нежанаты!.. / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 27 мая. — С. 5.

На ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» слесар І. Кузьміч з'яўляецца душой калектыву.

**Федаровіч, І.** З рацыянальным падыходам / Ігар Федаровіч ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2015. — 8 красавіка. — С. 2.

На Грушаўскім рамонтна-механічным заводзе праведзена рэарганізацыя вытворчых працэсаў.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2013 год ОАО «Грушевский РМЗ» // Заря. - 2014. — 22 марта. —С. 15.

**Пянко, А**. Человеческий фактор - движущий / Алексей Пянко ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2013.— 21 жніўня. — С. 3.

Дорогу в д. Грушево, на ремонтно-механический завод, знают тысячи заказчиков - здесь выполняют работы любой сложности.

**Папроцкі, П.** «У планах - працаваць плённа» / Пётр Папроцкі // Кобрынскі веснік. - 2012. - 8 жніўня. - С. 3.

**Пянко, А.** Грушевские мастера умеют всё / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2011. - 26 кастрычніка. - С.1,2.

**Гром, А.** Авторитет подтверждается качеством / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 13 лістапада. - С. 2.

О работе ОАО «Грушевский РМЗ», директор Петр Папроцкий.

**Бялоў, Д.** Дасканалы рухавік поспеху / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 17 верасня. - С. 8.

Грушаўскі рамонтна-механічны завод.

**Пянко, А.** Интернет: дорога в Грушево / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2008. - 17 верасня. - С. 2.

ОАО «Грушевский РМЗ».

**Рудковский, А**. Второе дыхание белорусской мелиорации / Александр Рудковский // Народная газета. - 2008. - 29 ліпеня. - С. 9.

ОАО «Грушевский РМЗ», директор Петр Папроцкий.

**Мельнік, Р.** «Грушаўскі РМЗ» - марка надзейная / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2007. - 7 красавіка. – С. 2.

**Новые** заказчики: ОАО «Грушевский РМЗ» // Заря. – 2006. – 16 марта.

**Пянко, А.** В портфеле предприятия – новые заказы / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 11 лютага. – С. 2.

ОАО «Грушевский РМЗ».

**Отчет** о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Грушевский РМЗ» за 2004 год // Кобрынскі веснік. – 2005. – 28 мая. – С. 8.

**Хільчук, М**. З думкай аб заўтрашнім дні / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 29 студзеня. – С. 2.

Грушаўскі РМЗ.

**Пянко, А.** Завод у сельскай глыбінкі / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 27 сакавіка. – С. 6-7.

Грушаўскі РМЗ.

**Пятроўская, М.** Добры фініш, не горшы старт / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 4 лютага. – С. 2.

Аб выніках работы ААТ «Грушаўскі РМЗ» за 2003 год.

**Пянко, А**. Складаныя заказы ідуць у Грушава / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 5 красавіка. – С. 3.

Грушаўскі РМЗ.

**Грушаўскі рамонтна-механічны завод** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 2 лютага. – С. 2.

**Пянко, А**. Дзелавое партнёрства / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 23 студзеня. – С. 2.

Аб партнёрскіх сувязях Грушаўскага РМЗ.

**Пянко, А**. Нестандартнае – увагі вартае / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2002. - 25 мая(№42-43). - С. 3.

Грушаўскі РМЗ.

**Пянко, А.** Шырокі профіль рамонтнікаў / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2002. - 30 красавіка. - С. 2.

Грушаўскі РМЗ.

**Завод** нарошчвае вытворчасць // Кобрынскі веснік. – 2001. – 24 лютага (№ 17). – С. 2.

Грушаўскі РМЗ.

**Пянко, А**. Маналіт пашырае сферу паслуг / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 19 ліпеня (№57). – С. 2.

Грушаўскі РМЗ.

**Пянко, А**. Працуе надзейна / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 2 жніўня (№ 61). – С. 1.

Аб слесары Грушаўскага РМЗ М. М. Вайтовічу.

**Хільчук, М**. З гаспадарскім падыходам / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 23 снежня (№ 101). – С. 2.

Кобрынскі раён
Грушава
Грушаўскі рамонтна-механічны завод
Заводы
Папроцкі Пётр Сяргеевіч